Гродненский областной исполнительный комитет

УЧРЕЖДЕНИЕ ОБРАЗОВАНИЯ
«ГРОДНЕНСКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ УНИВЕРСИТЕТ
ИМЕНИ ЯНКИ КУПАЛЫ»

ИСТОРИЧЕСКИЙ ФАКУЛЬТЕТ

# 60-ЛЕТИЕ ОБРАЗОВАНИЯ ГРОДНЕНСКОЙ ОБЛАСТИ

Материалы Международной научной конференции

3-4 марта 2004 года

Гродно

Республика Беларусь

Гродно 2004

УДК 94(476)
ББК 63.3(4Беи)
Ш51

Редакционная коллегия: доцент В.А.Белозорович (ответственный редактор),
доцент И.О.Змитрович,
доцент М.Я.Колоцей,
доцент С.А.Пивоварчик,
доцент Н.В.Козловская,
доцент И.В.Соркина.

Рекомендовано Советом УО «Гродненский государственный университет имени Янки Купалы».

Ш51 **60-летие** образования Гродненской области: Материалы Междунар. науч. конф., 3-4 марта 2004 г., Гродно / Отв. ред. В.А.Белозорович. – Гродно: ГрГУ, 2004. – 456 с.

ISBN 985-417-606-1

В сборник включены доклады Международной научной конференции по следующим направлениям: история Гродненщины до образования Гродненской области, социально-экономическое развитие Гродненской области с 1944 до 2004 г., этнокультурное развитие Гродненской области с 1944 до 2004 г., Гродненская область в меняющемся мире.

**УДК 94(476)**
**ББК 63.3(4Беи)**

**ISBN 985-417-606-1**

© Оформление. ГрГУ им. Я.Купалы, 2004

ского Совета создавались или реорганизовывались из сельских клубов СДК (сельские Дома культуры), которые направляли и координировали работу сельских клубов в окружающих поселениях. Улучшалась материальная база сельских учреждений культуры. Число сельских библиотек имело незначительную тенденцию к сокращению, но при увеличении книжных фондов. В рассматриваемый период широко развивались народное творчество, художественная самодеятельность. Большое внимание уделялось шефской культурно-просветительной работе на селе со стороны предприятий и учреждений культуры города.

*Список литературы*


1. Гродненская область за годы Советской власти: Статистический сборник. – Гродно, 1977. – 399 с.
2. Гродненщина к 60-летию СССР: Статистический сборник. – Гродно, 1982. – 329 с.
3. Архив Гродненского областного статистического управления.
4. Архив Министерства сельского хозяйства Республики Беларусь, д. 9439.
5. Архив Министерства образования Республики Беларусь, д.12/7.
6. Национальный архив Республики Беларусь. Ф. 46,оп.11, д.634.
7. Архив Министерства культуры Республики Беларусь, д.468.
8. Архив Министерства культуры Республики Беларусь, д.1235.
9. Архив Министерства культуры Республики Беларусь, д.1157.



**С.Куль-Сяльверстава**

*(г.Гродна, ГрДУ імя Я.Купалы)*


## ГРОДЗЕНСКІ АБЛАСНЫ ДРАМАТЫЧНЫ ТЭАТР У 1946–1982 Г.

Тэатральныя традыцыі Гродна налічваюць некалькі стагоддзяў. Гродзенскі абласны драматычны тэатр з’яўляецца нашчадкам гэтых традыцый, развівае і працягвае іх. За амаль шэсць дзесяткаў гадоў сваёй гісторыі ён перажыў розныя падзеі, былі свае перамогі і пралікі, але заўсёды ён увасабляў эпоху, быў люстрам, у якім адбівалася навакольнае жыццё.

Гісторыя Абласнога драматычнага тэатра ў Гродне пачалася амаль адначасова са стварэннем Гродзенскай вобласці. Пасля вызвалення Гродна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў услед за наступаючымі часцямі Першага Беларускага фронту ў горад на Нёмане прыехаў адзін з лепшых калектываў Беларусі – Дзяржаўны рускі драматычны тэатр БССР. Гэты калектыў выступаў на гродзенскай сцэне да яго пераводу ў Мінск у 1947 г. Абласному цэнтру неабходны быў уласны тэатр. Ён быў утвораны ў верасні 1947 г. Аснову гэтага калектыву склала трупа Бабруйскага абласно-

га тэатра, утвораная на базе калгасна-саўгаснага тэатра. Упершыню маладая трупа прыехала сюды ў 1946 г. Як успамінала заслужаная артыстка БССР Ганна Купрыянаўна Панкрат, якая іграла ў той час на бабруйскай сцэне, ад'язджаючы ў Гродна, артысты вельмі хваляваліся – гэта былі першыя гастролі маладога калектыва. Ехалі ў цяплушках, везлі з сабой не толькі касцюмы і дэкарацыі, але ўсё неабходнае для жыцця ў знявечаным вайной горадзе. Для першых гастроляў бабруйчане абралі пяць спектакляў: «Урок жыцця» В.Галаўчынера, «Праўда добра, а шчасце лепей» А.Астроўскага, «Каварства і каханне» Ф.Шылера, «Дама-невідзімка» К.Кальдэрона і «Лісічкі» Л.Хелмана. Выступленні тэатра былі цёпла прыняты гледачамі. Пасля вяртання ў Бабруйск акцёры горача абмяркоўвалі магчымасць пераезда ў Гродна, дзе пакуль што часова выступаў Дзяржаўны рускі тэатр, які ўжо рыхтаваўся да ад'езду ў сталіцу. Гродна прываблівала артыстаў даўнімі тэатральнымі традыцыямі, зацікаўленымі гледачамі і добрым тэатральным будынкам. Я.М.Кімберг, народны артыст БССР, які ў той час быў у трупе Бабруйскага тэатра, згадваў, што, калі ў верасні 1947 г. трупа атрымала дазвол на пераезд, артысты ўспрынялі гэта з вялікім энтузіязмам.

У склад трупы Бабруйскага тэатра, якая перабралася ў Гродна, уваходзілі М.В.Кавязіна, Я.М.Кімберг, Г.К.Панкрат, М.Анісімаў, Н.Р.Вінтоўкіна, М.Я.Раманаў, У.Я.Левандоўскі, А.А.Чарнушчанка і іншыя. Узначальваў тэатральную трупу выдатны тэатральны дзеяч, рэжысёр, мастак і педагог, заслужаны артыст БССР Мікалай Аляксандравіч Кавязін. Пераехаўшы разам з калектывам у Гродна, Мікалай Аляксандравіч працаваў тут да канца жыцця. Памёр ён у 1950 г.

У першы год работы артысты Гродзенскага абласнога тэатра аднавілі некалькі спектакляў, якія былі пастаўлены яшчэ ў Бабруйску: «За тых, хто ў моры» Лаўрэнёва, «Памятныя сустрэчы» Уцеўскага, «Рускае пытанне» Сіманава. На рэжысёрскую работу ў першыя гады існавання тэатра быў запрошаны вопытны рэжысёр Ю.А.Арынянскі. З тэатрам плённа супрацоўнічаў выдатны музыкант і кампазітар, фалькларыст і хармейстар Я.К.Цікоцкі, які пісаў музыку для спектакляў. З першых гадоў існавання тэатра з гродзенцамі супрацоўнічаў А.П.Марыкс, народны мастак БССР, таленавіты тэатральны майстар. У складзе ГДТ у гэты час было многа моладзі, якая вярнулася на сцэну пасля вайны. Акцёры з вялікім энтузіязмам пачалі работу над новымі спектаклямі. Галоўную частку рэпертуара ў гэты час складалі творы савецкіх аўтараў. Этапнымі для тэатра сталі «Шчасце» М.Аляксеева паводле рамана П.Паўленкі; «Вялікая сіла» паводле п'есы Рамашова; «Маскоўскі характар» паводле А.Сафронава. Аб спектаклі паводле п'есы М.Аляксеева «Шчасце» ў пастаноўцы М.Кавязіна «Гродненская правда» пісала: «Спектакль атрымаўся вельмі цікавы, хвалюючы, і выхаваўчае значэнне яго цяжка пераацаніць» [1]. Шмат гадоў ішоў на гродзенскай сцэне спектакль па п'есе К.Сіманава «Рускае

пытанне», у якім уздымалася тэма «халоднай вайны». Пастаўлены ў 1947 г. М.Кавязіным, ён быў адноўлены праз два дзесяткі гадоў А.П.Струніным. У рэпертуар увайшлі і творы класікаў – М.Астроўскага «Не ўсё кату масленіца» (1948 г.) і «Свае людзі – пагадзімся» (1949 г.); М.Горкага «На дне» (1950 г.).

З 1952 па 1955 гады ў тэатры памянялася некалькі галоўных рэжысёраў. Тут працавалі Ю.Юроўскі, І.Парамонаў, С.Стасенка, С.Рахманаў, А.Міронскі. Частая змена рэжысёраў не спрыяла мастацкаму развіццю тэатра, побач з моцнымі, удалымі пастаноўкамі сустракаліся па-сапраўднаму слабыя работы.

У 1955 г. на пасаду галоўнага рэжысёра тэатра прыйшоў І.С.Папоў, які пакінуў заўважальны след у гісторыі гродзенскай сцэны. «Іосіф Іванавіч Папоў, – пісала аб ім у «Гродненской правде» Н.Міхайлава, – патрабавальны мастак, які знаходзіцца ў пошуку... Ён патрабуе ад выканаўцаў найвялікшай творчай сабранасці, скрайней увагі, імкнецца дасягнуць магчымай выразнасці, выказваючы пры гэтым велізарнае цярпенне і настойлівасць» [2]. І.С.Папоў прыйшоў у гродзенскі тэатр ужо маючы значны вопыт работы. Пасля заканчэння ў 1938 г. Архангельскага тэатральнага вучылішча, а затым ДІТМ (ГИТИС) ён працаваў у тэатрах Архангельска, Уладзіміра, Кемерава, Навакузнецка. У 1947-1948 г. быў рэжысёрам Дзяржаўнага рускага драматычнага тэатра БССР, а затым два гады ўзначальваў Брэсцкі тэатр імя ЛКСМБ. Пад кіраўніцтвам І.С.Папова ГДТ значна абнавіў і папоўніў свой рэпертуар. У 1955–1963 гг. гродзенскія гледачы ўбачылі «Мараль пані Дульскай» Т.Запольскай, «Дзень цудоўных падманаў» В.Шэрыдана, «Дачнікаў» М.Горкага, «Мачаху» А. дэ Бальзака, «Вяселле Фігара» П.Бамаршэ, «Трох сяброў» Э.М.Рэмарка і іншыя спектаклі. Адначасова з галоўным рэжысёрам пастаноўкі ў Гродне ажыццяўлялі рэжысёры А.Герынбург, М.Зорын, А.Брыльянтшчыкаў. Этапным для тэатра стаў спектакль паводле п’есы фінскага драматурга Х.Вуайліёкі, які вельмі добра прынялі гледачы. Бліскучаігралі ў ім Г.Панкрат і С.П.Іванова [3]. У 1960 г. да стагоддзя вялікага пісьменніка і драматурга А.Чэхава на гродзенскай сцэне былі пастаўлены «Тры сястры». Своеасаблівым падвядзеннем вынікаў сталі ў гэты час яго гастролі ў Мінску. Выступленні гродзенцаў на сталічнай сцэне ў 1961 г. былі адзначаны гледачамі і добра прыняты тэатральнай крытыкай. У 1963 г. І.С.Папоў быў запрошаны на працу ў тэатр імя Якуба Коласа.

З 1964 года галоўным рэжысёрам ГДТ быў прызначаны Аляксандр Пятровіч Струнін. Да свайго прыезда ў Гродна ён меў значны вопыт рэжысёрскай работы: працаваў галоўным рэжысёрам тэатраў Балтыйскага і Ціхаакеанскага флотаў, дзе выступаў і як акцёр. Падчас вайны А.П.Струнін узначальваў франтавую тэатральную брыгаду. У 1960 г. за шматгадовую плённую творчую працу яму было прысвоена званне Заслужанага

дзеяча мастацтваў РСФСР. Ужо першая значная работа А.П.Струніна – спектакль «Порт-Артур» паводле А.Сцяпанава, паказала, што ў тэатр прыйшоў сапраўдны майстар, здольны на эксперымент, прафесійна валодаючы сакрэтамі тэатральнага мастацтва. «Новы спектакль, – пісала «Гродненская правда», – безумоўная ўдача рэжысёра і творчага калектыва... Невыпадкова кожнае прадстаўленне п’есы адбываецца пры перапоўненай зале» [4]. Публіка і тэатральная крытыка адзначалі бліскучую ігру Я.М.Кімберга, В.Ф.Грачынскага, М.В.Кавязінай, С.Аляксандрава і іншых акцёраў, занятых у спектаклі.

У 1965 г. быў пастаўлены этапны для тэатра спектакль «Дачка Расіі» паводле п’есы П.Чараднічэнка. Грамадзянскай смеласцю рэжысёра і акцёраў трупы ў рэалізацыі гэтага твора на сцэне было тое, што аднымі з дзейнічаючых асобаў п’есы з’яўляліся К.Маркс (акцёр Я.М.Кімберг) і Ф.Энгельс (акцёр В.Дзёмін). Класік марксізма ў выкананні Я.Кімберга атрымаўся «..ветлівы, тактычны, душэўна далікатны, інтэлігентны...Ён, апрача іншага, разумны суразмоўца, шчодра надзелены жартам і гумарам» – адзначалася ў рэцэнзіі на спектакль [5]. Крытыка адзначыла таксама выканаўцу галоўнай ролі рэвалюцыянеркі Лізы Туманавай Л.Стоpажаву. Праз два гады, да 50-годдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі, на сцэне ГДТ з’явіўся вобраз яшчэ аднаго класіка марксізма – В.І.Леніна. Яго сыграў Я.М.Кімберг у спектаклі паводле п’есы А.Штэйна «Паміж ліўнямі» [6]. 7 кастрычніка 1967 г. Я.М.Кімберг выконваў ролю Леніна на інсцэніраваным шэсці, прысвечаным юбілею рэвалюцыі.

У 1967 г. Гродзенскі абласны драматычны тэатр адзначыў дваццацігоддзе сваёй творчай дзейнасці. За гэты час калектыў тэатра паказаў гродзенцам каля 180 прэм’ер, яго спектаклі наведалі каля 4 млн. гледачоў. Тэатр гасцінна прымалі на гастролях у Літве, Латвіі, РСФСР, на Украіне і ў Польшчы. На гродзенскай сцэне падчас юбілею працавалі вопытныя акцёры – народны артыст БССР Я.Н.Кімберг, заслужаныя артысткі рэспублікі Г.К.Панкрат і М.В.Кавязіна, Л.І.Стражаў, В.Ф.Грачынскі, П.П.Філіпаў, С.І.Аляксандраў. Павагай публікі карысталіся і прадстаўнікі малодшага пакалення – А.А.Цароў, Ю.А.Нікіцін, Л.М. Колікаў, Т.Нікалаева, Р.Адзіс, М.Малахаў, Л.Кірыш’янц і іншыя.

У 1968 г. гродзенскія гледачы наведалі прэм’еру дзвюх п’ес, аўтарам якіх быў галоўны рэжысёр тэатра А.П.Струнін – «Адплата» (у рускай версіі – «Возмездие») і «Я прысягаў Радзіме». Абедзве пастаноўкі былі напісаны па матэрыялах з гісторыі Гродзеншчыны, а ў апошняй з іх, прысвечанай подзвігу генерала Д.Карбышава, аўтар выкарыстаў дакументальныя матэрыялы, у тым ліку, сценаграмы допытаў генерала ў фашысцкім концлагеры. Гэтыя спектаклі мелі трывалыя аншлагі і прыхільную тэатральную крытыку [7].

Сярод лепшых пастановак тэатра канца 1960-х гг. належыць адзначыць спектакль паводле п’есы У.Вішнеўскага «Раскінулася мора шыро-

ка». Адметнасцю гэтага твору быў яго жанр – музычная камедыя для драматычнага тэатра з'яўляецца п'есай, цяжкай для пастаноўкі. Але гродзенскія акцёры даказалі свой прафесіяналізм – не толькі выдатна спявалі, але і танцавалі на сцэне [8]. Варта назваць таксама п'есу М.Булгакава «Дні Турбіных», пастаўленую на гродзенскай сцэне ў 1973 г. Сярод цікавых работ калектыва ў гэтыя гады былі «Чалавек і глобус» паводле п'есы В.Лаўрэнцьева, Г.Запольскай «Пані Малічэўская», А.Макаёнка «Трыбунал», А.Астроўскага «Навальніца», Э.Растана «Сірано дэ Бержэрак» і іншыя.

У 1974 г. тэатр быў закрыты на рамонт і каля года перабудоўваўся. Пасля аднаўлення работы значна змяніўся склад творчага калектыва. На адпачынак былі адпраўлены А.П.Струнін, Я.М.Кімберг, А.К.Панкрат і іншыя вопытныя акцёры. У тэатр прыйшла моладзь, якая, у большасці, не мела вялікага сцэнічнага вопыту, але была схільна да эксперыменту, да пошуку. Трупу ўзначаліў Ул.А.Караткевіч, які да гэтага працаваў рэжысёрам абласнога тэатра ў Магілёве. У 1975–1979 гг. ім былі пастаўлены на гродзенскай сцэне «Аптымістычная трагедыя» У.Вішнеўскага, «Беспасажніца» А.Астроўскага, «Мілы чалавек» К.Крапівы, «Камуніст» Я.Габрыловіча, «Францыск Скарына» А.Петрашкевіча і іншыя спектаклі. Адметнасцю работы гродзенцаў у гэтыя гады стаў зварот да нацыянальнай беларускай драматургіі, да сюжэтаў з айчыннай гісторыі. Безумоўнай удачай Ул.Караткевіча і ўсёй трупы быў пастаўлены ў 1976 г. спектакль «Мілы чалавек» паводле п'есы К.Крапівы. Гледачы і крытыка адзначылі выдатную работу Ул.Мішчанчука, які выконваў галоўную ролю [9]. Пошук новых форм сцэнічнай творчасці выявіўся ў спектаклі «Камуніст»: у пачатку спектакля акцёр С.Кліменка, які выконваў галоўную ролю, падымаўся на сцэну з глядзельнай залы і апавядаў гледачам аб часе і месцы дзеяння, аб сваім героі – Васіле Губанаве. Падчас апавядання на сцэну паступова выходзілі іншыя дзеючыя асобы п'есы і незаўважальна пачыналася само тэатральнае дзеянне. Поўнай глыбіні і псіхалагізма была ў гэтым паказе сцэнічная работа Л.Волкавай, заслужанага артыста БССР Ул.Мішчанчука, В.Грачынскага. Поспеху спектакля садзейнічала выдатнае афармленне спектакля, створанае мастаком М.Якуніным.

У рэпертуары тэатра ў гэты час галоўнае месца займалі п'есы савецкіх драматургаў: «Мае надзеі» М.Шатрова, «Фантазіі Фарацьева» А.Сакаловай, «Жорсткія гульні» А.Арбузава, «Грошы для Марыі» В.Распуціна і іншыя. Арыентацыя на рэалізацыю на сцэне твораў нацыянальнай драматургіі вылілася ў пастаноўку двух этапных для тэатра спектакляў. У 1979 г. рэжысёрам А.Ушацкім была пастаўлена «Паўлінка» Я.Купалы, дзе ўдала сыгралі Л.Кучарэнка (Паўлінка) і Ул.Мішчанчук (Быкоўскі). Доўга не зыходзіў з тэатральнай афішы спектакль «Несцерка»

паводле п’есы А.Вольскага. Рэжысёр В.Сімакін выкарыстаў магчымасці, якая давала п’еса, – увёў у спектакль імправізацыі, пантаміму, трукі.

Не так удала атрымліваліся ў гэты час у гродзенцаў п’есы класічнага рэпертуара. Пэўна, найбольш значнай сярод іх быў спектакль «Зыкавы» паводле п’есы М.Горкага. Як адзначалася на абмеркаванні спектакля пасля гастроляў у Мінску у 1981 г., гэтая п’еса пацвердзіла мастацкія магчымасці калектыву, але адначасова высветліла і слабыя месцы ў рэжысуры і акцёрскіх працах.

У 1981 г. галоўным рэжысёрам тэатра быў прызначаны А.Шалыгін, які да гэтага працаваў у тэатры імя Я.Купалы. Першай і, пэўна, найбольш значнай работай яго на гродзенскай сцэне стаў спектакль «Вішнёвы сад» паводле п’есы А.Чэхава. Трактоўка класічнага твору была ў многім спрэчнай, ішла насуперак склаўшайся традыцыі: запаволены тэмп, паглыбленая ўвага да асобных псіхалагічных момантаў, сцэнаграфія, выкананая К.Шыманоўскай, надавала спектаклю своеасаблівы характар. Гэтая п’еса была першай, якая прайшла на сцэне новага тэатральнага будынка, адкрытага ў 1982 г., пабудаванага па праекце вядомага беларускага архітэктара Мачульскага. Архітэктар імкнуўся ўпісаць новы будынак у архітэктурнае асяроддзе, якое гістарычна склалася ў самай старажытнай частцы горада. У афармленні тэатральнага будынка прымалі ўдзел скульптар Зільберт, мастакі шклозавода «Нёман» у супрацоўніцтве з гродзенскімі скульптарамі і мастакамі К.Асадавым, С.Паляковым, А.Салятыцкім. Інтэр’ер быў аздоблены дэкаратыўнымі работамі І.Лаўровай і І.Пчэльнікава.

Пасляваенныя гады былі для гродзенскай сцэны часам развіцця, часам аднаўлення даўніх тэатральных традыцый, часам пошукаў уласнага аблічча ў тэатральным свеце. За гэты перыяд гродзенцы сталі вядомым калектывам не толькі ў рэспубліцы, але і за яе межамі. Гродзенскія старажылы з удзячнасцю ўзгадваюць многіх дзеячоў ГДТ, якія сталі неад’емнай часткай творчага жыцця горада на Нёмане, – заснавальніка тэатра М.А.Кавязіна, Я.М.Кімберга, А.К.Панкрат, В.Ф.Грачынскага, І.С.Папова, М.В.Кавязіну, А.П.Струніна, Ул.Мішчанчука і многіх іншых.

### *Спіс літаратуры*


1. Гродненская правда, 13 февраля 1949 г.
2. Гродненская правда. 27 января 1960 г.
3. Там же. 22 марта 1959 г.
4. Там же. 28 ноября 1963 г.
5. Літаратура і мастацтва. 5 лістапада 1965 г.
6. Гродненская правда. 11 декабря 1966 г.
7. Гродненская правда. 30 ноября 1968 г.
8. Там же. 17 мая 1968 г.
9. Гродненская правда. 19 ноября 1976 г.

## СОДЕРЖАНИЕ

**Пленарное заседание** .......................................................................... 3

*Омелько В.П.* Социально-экономическое развитие Гродненской области на современном этапе ........................................................................ 3

*Крэнь І.П., Белазаровіч В.А.* Гродзенскай вобласці 60 гадоў ......... 17

*Коўкель І.І.* Знакамітыя людзі Гродзеншчыны ................................ 28

**Секция 1. История Гродненщины до образования Гродненской области** .......................................................................... 36

*Віцязь С.П.* Яцвяжская тапаніміка на тэрыторыі Беларусі ............. 36

*Чаропка С.А.* Казацка-сялянская вайна 1648–1651 г. на Гродзеншчыне .......................................................................... 40

*Козловская Н.В.* Шляхта Гродненского повета: опыт реконструкции .......................................................................... 43

*Сіплівеня Т.С.* Падзеі 1812 г. у Гродзенскай губерні ....................... 48

*Марозава С.В.* Супраціў дэмантажу уніяцкай царквы на Гродзеншчыне ў 30 – 60-я г. XIX ст. ...................................................... 53

*Хилюта В.А.* Землепользование и землевладение помещичьих крестьян Гродненской губернии в середине XIX в. .............................. 59

*Афанасьева Т.Ю.* Развитие торговли в Гродненской губернии (первая половина XIX в.) ........................................................................ 63

*Швед В.В.* Гісторыя Гродзеншчыны (са старажытнасці да 1944 г.) як аб’ект турызму і экскурсій ................................................ 65

*Полетаева Н.И.* Купечество Гродненской губернии: социально-демографические аспекты (60-е г. XIX – начало XX в.) ........................ 72

*Карев Д.В.* Историко-экономические исследования западно-белорусского региона в белорусской науке XIX – начала XX в. ........... 76

*Игнатович Ф.И.* Врач–гуманист и атеист Ю.Ф.Бенецкий (к 175–летию со дня рождения) .......................................................... 80

*Проценко О.Э.* П.Бобровский и А.Киркор об уездных городах Гродненской губернии в середине и второй половине XIX в. .............. 85

*Піваварчык С.А.* Эвалюцыя гродзенскай фартыфікацыі (XI – XX ст.) ........................................................................................ 92

*Линкевич В.Н.* Конфессиональный состав населения г. Гродно во второй половине XIX – начале XX в. .................................................. 98

*Лябецкі У.С.* З гісторыі музычнага жыцця Гродзеншчыны канца XIX – пачатку XX ст. .................................................. 102

*Змитрович И.О., Устюгова А.Г.* П.А.Столыпин о реформировании сельского хозяйства Гродненской губернии ......... 107

*Dr Adrian Konopka* Legion Puławski na szlaku bojowym do Zelwy .. 110

*Prof. dr hab. Hanna Konopka* Studenci z Białorusi na uniwersytecie w Białymstoku .................................................. 115

*Загідулін А.М.* Спробы паланізацыі праваслаўнай царквы на Гродзеншчыне ў 20 – 30-я г. XX ст. .................................................. 118

*Черепица В.Н.* «Православные поляки» на Гродненщине (1934 – 1939 г.) .................................................. 123

*Глина В.Н.* Проблемы становления научно-теоретического знания в контексте национально-возрожденческой идеологии в Западной Белоруссии (1921 – 1939 г.) .................................................. 134

*Толочко Д.М.* Кадровая политика ЦК КП(б)Б в западной Беларуси в сентябре 1939 – июне 1941 г. (на примере Белостокской области) ...... 140

*Daniel Boćkowski* Przekształcenie obwodu Białostockiego w obwód Grodzieński we wrześniu 1944 roku .................................................. 143

*Колоцей М.Я.* Антифашистское подполье в Гродненском гетто .... 151

*Васілючак М.В., Нядзелька У.А.* Вызваленне Смаргоншчыны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў .................................................. 155

*Журавков М.А.* Освобождение Гродненщины от немецко-фашистских захватчиков и увековечение памяти жертв фашизма ..... 159

*Кривеня Т.В.* «Четыре года и вся жизнь» (о судьбе детей международного пионерского лагеря при санатории «Новоельня») ... 163

*Michał Gnatowski* Uwagi do kwestii przebiegu granicy wschodniej na obszarach Białostocczyzny i Grodzieńszczyzny w latach II wojny światowej (1939-1945) .................................................. 168

**Секция 2. Социально-экономическое развитие Гродненской области с 1944 до 2004 г. .................................................. 172**

*Белозорович В.А.* Массовая коллективизация сельского хозяйства в Гродненской области (1949 – 1953 г.) .................................................. 172

*Иващенко Н.А.* История создания и деятельность областной профсоюзной организации ........ 179

*Іванчук Б.М.* Гродзеншчына ў 1986–1995 г. (сацыяльна-эканамічныя пазіцыі) ........ 182

*Венгер Ю.И.* Социальная политика государства по защите инвалидов в Гродненской области ........ 186

*Байтасов Р.Р.* Реформирование АПК Гродненской области – объективная необходимость ........ 190

*Андрейчик Г.Ф., Писарев В.К.* Реальность и проблемы развития фермерских хозяйств Гродненского региона ........ 194

*Касьянович Г.Г.* Реформы АПК: некоторые проблемы и пути их решения ........ 198

*Рапецкая С.И.* Гендерные особенности безработицы в Гродненской области в переходный период ........ 201

*Юргель Н.В.* Анализ состояния малого бизнеса в Гродненской области в современных условиях ........ 204

*Лепешев Д.И.* Статистический анализ производительности труда малых предприятий Гродненской области ........ 208

*Данилевич А.А.* Новые технологии управления процессами адаптации ........ 213

*Пшеславская Н.М.* Активизация инновационной деятельности в Гродненской области – условие стабилизации экономики ........ 218

*Селина Т.Е.* Анализ исторических аспектов развития системы местных налогов на этапе становления Гродненской области (1944 – 1950 г.) ........ 221

**Секция 3. Этнокультурное развитие Гродненской области с 1944 до 2004 г. ........** 227

*Милоста Н.Н.* Главная библиотека Гродненщины в русле культурного развития области ........ 227

*Турмасава Л.І.* Бібліятэчнае краязнаўства – дзейсны сродак дакументнага і бібліяграфічнага забеспячэння краязнаўчага руху Гродзеншчыны ........ 231

*Амелька С.У.* Станаўленне і развіццё перыядычнага друку на Гродзеншчыне ў пасляваенны час ........ 235

*Панцевич А.П.* Место лицея в образовательном пространстве Гродненской области ........ 238

*Миронович Е.А.* История развития Учреждения образования «Гродненский государственный педагогический колледж» ........ 243

*Улейчик Н.Л.* Создание учебных заведений нового типа в Гродно в 1990-е годы ........ 246

*Пятраўскас М.А.* Стан сістэмы народнай адукацыі ў заходнім рэгіёне Беларусі (1939–1941 г.) ........ 250

*Мартыненко И.Э.* Правовые проблемы сохранения памятников культуры Гродненщины ........ 255

*Словік С.* Шляхецкія сядзібы Гродзеншчыны як гісторыка-культурны феномен: іх сучасны стан і перспектывы выкарыстання .. 260

*Лоечко Г.С.* Культурное развитие Волковыщины в составе Гродненской области (1944 – 2004 г.) ........ 264

*Мартен М.В.* Социально-культурные преобразования в селах Гродненщины в 1960–1970-х г. ........ 270

*Куль-Сяльверстава С.* Гродзенскі абласны драматычны тэатр у 1946–1982 г. ........ 274

*Попко Л.Ф.* Развитие олимпийского движения в Гродненской области на современном этапе (1992–2004 г.) ........ 280

*Добриян А.А.* Охрана и изучение археологических памятников Гродненщины в 1944 – 1950 г. ........ 283

*Какареко В.И.* Монетные клады из собрания Гродненского государственного историко-археологического музея ........ 287

*Пяткевіч А.М.* Культурныя здабыткі Гродзеншчыны ў музейных экспазіцыях вобласці ........ 297

*Янулевич А.С.* Роль школьного музея в преподавании истории и патриотическом воспитании молодёжи ........ 301

*Макарчук А.С.* Историческое краеведение и его роль в патриотическом воспитании школьников ........ 304

*Волошик С.В.* Воспитание патриотизма и гражданственности на примере героизма и мужества воинов 42 стрелковой дивизии, освобождавших Гродненщину ........ 307

*Саяпин В.Ю.* Образование и становление Гродненской таможни 311

*Абызов О.Б.* История Гродненского пограничного отряда ............ 315

*Мазько Э.А.* Этнаканфесійная сітуацыя на беларуска-польскім памежжы (на прыкладзе матэрыялаў Сапоцкінскага мікрарэгіёну) .. 320

*Чувак С.* Этнічныя гетэрастэрэатыпы ва ўяўленнях жыхароў Гродзеншчыны (на матэрыяле Сапоцкінскага і Парэчскага сельскіх саветаў) ........ 325

*Ситкевич С.А.* Польское антисоветское подполье на территории послевоенной Гродненщины в современной польской историографии ........ 330

*Рыбак Н.А.* Структурная организация и деятельность польского подполья на территории Гродненской области в 1944–1948 г. ........... 335

*Вялікі А.Ф.* Перасяленне польскага насельніцтва з Гродзенскай вобласці ў Польшчу 1944-1946 г. Прычыны. Ход. Вынікі ........ 342

*Кручковский Т.Т.* Polacy na Grodzieńszczyźnie po II wojnie światowej (zarys historyko-demokratycznej problematyki) ........ 347

*Ганчар А.И.* Объединения при римско-католических костёлах: традиция и современность ........ 361

*Ярмусік Э.С.* Каталіцкі Касцёл у этнасацыяльных і культурных працэсах на Гродзеншчыне ........ 365

*Гончаров Н.Н.* Религиозные секты на территории Западной Белоруссии в межвоенный период ........ 370

*Епископ Антон Демьянко.* Католическая Церковь на территории Гродненщины ........ 375

*Черняк Ю.В.* Организационная структура и особенности деятельности ОУН-УПА на территории Беларуси (1939–1944 г.) ...... 380

*Пчельник Е.В.* Православная церковь на Гродненщине в первые послевоенные годы ........ 384

**Секция 4. Гродненская область в меняющемся мире** ............ 388

*Гарелик П.В., Арцукевич И.М., Тищенко Е.М.* Роль Гродненского медуниверситета в жизни Гродненщины ........ 388

*Нечухрин А.Н.* Актуальные проблемы теоретической подготовки специалистов историков на историческом факультете Гродненского государственного университета имени Янки Купалы ........ 390

*Ильина Т.А.* Наш край в контексте исторического образования (опыт сотрудничества лицея и исторического факультета ГрГУ им. Я. Купалы) ........ 394

*Болтрукевич С.И., Карев Б.А., Азаров Ю.А.* Достижения и проблемы травматологии и ортопедии в Гродненской области ........ 397

*Барханов Г.П., Венская И.Г.* Развитие страховой медицины в условиях трансформации экономики Гродненской области ........ 400

*Степаненко И.Б.* Проблемы качества жизни молодежи и молодежная политика в трансформирующемся обществе ........ 403

*Донских С.В.* Гродненщина в XXI веке: пограничье в условиях глобализации ........ 407

*Хилюта В.В., Ватыль В.Н.* Политические партии и общественные объединения на территории Гродненщины: основные тенденции развития ........ 416

*Беспамятных Н.Н.* Гродненский регион: «плавильный котел» или культурный плюрализм? ........ 421

*Кривощекий Г.М.* Гродненская область в условиях трансформации общества ........ 425

*Бородич А.А.* Социокультурные идеалы мыслителей Гродненщины и современность ........ 428

*Вансович Д.В.* Развитие трансграничных отношений Гродненской области с Польшей ........ 434

*Копытко А.И.* Из истории философской мысли на Гродненщине. XVIII век – от схоластики к новой философии ........ 436

*Романов О.А.* Гродненщина как арена столкновения и синтеза восточнославянской и западноевропейской цивилизаций ........ 441

*Семерник С.З.* Духовно-ментальное самоопределение гродненцев в современном мире ........ 445

*Добриян О.А.* Гродненщина: переходное общество в условиях глобализации ........ 448

Научное издание

# 60-ЛЕТИЕ ОБРАЗОВАНИЯ ГРОДНЕНСКОЙ ОБЛАСТИ

Материалы Международной
научной конференции

Редакторы: Н.П.Дудко, Н.Н.Красницкая

Компьютерная верстка: В.И.Карасик

Сдано в набор 15.06.2004. Подписано в печать 18.08.2004.
Формат 60х84/16. Бумага офсетная.
Печать RISO. Гарнитура Таймс.
Усл.печ.л. 26,50. Уч.-изд. л. 33,07. Тираж 120 экз. Заказ .

Учреждение образования «Гродненский государственный
университет имени Янки Купалы».
ЛИ № 02330/01633257 от 30.04.2004. Ул. Пушкина, 39, 230012, Гродно.

Отпечатано на технике издательского центра
Учреждения образования «Гродненский государственный
университет имени Янки Купалы».
ЛВ № 02330/0056882 от 30.04.2004. Ул. Пушкина, 39, 230012, Гродно.